# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069(1-4):17.035.3

*М. А. Бяспалая*

## Музей як візуальны сімвал нацыянальнага адраджэння

*Аўтар артыкула на падставе комплекснага падыходу ў спалучэнні з хранаалагічным і эвалюцыйным прынцыпамі аналізуе фактары, якія ўздзейнічалі на працэсы нацыянальнага адраджэння, развіцця музейнай справы ў беларускіх губернях XIX – пачатку XX ст. Разглядаюцца палітычныя і сацыякультурныя ўмовы, якія садзейнічалі з'яўленню прыватных і створаных пры бібліятэках і статыстычных камітэтах беларускіх музеяў (іх значэнне і недахопы). Выяўлены прычыны, якія стрымлівалі зараджэнне ў гэты перыяд нацыянальнага музея як маркера нацыянальнай ідэнтычнасці.*

Зараджэнню і асаблівасцям нацыянальнага адраджэння ў еўрапейскіх краінах прысвечана неабсяжная колькасць навуковых, навукова-папулярных і публіцыстычных прац. Гэтымі праблемамі займаліся прадстаўнікі розных гістарычных, філасофскіх, сацыяльных, культурных навуковых школ, якія зрабілі адметны ўнёсак у вызначэнне нацыі на падставе лінгвістычных, эканамічных, палітычных, культуралагічных, геаграфічных, рэлігійных і іншых характарыстык. Прадстаўнікі кожнай навуковай школы ў працэсе фарміравання нацыі на першае месца ставілі адпаведныя ўмовы, напрыклад суб'ектыўнае пачуццё і імкненне групы людзей да сумеснага пражывання ці адносіны людзей рознага этнічнага паходжання да агульнай тэрыторыі пражывання як да сваёй радзімы; ці ўплыў на гэты працэс сацыяльна-эканамічных і культурна-інтэграцыйных фактараў і інш.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў удакладненне паняцця «нацыя» працягваецца. Сучасныя вучоныя, у ліку якіх М. Грох, да пазначаных вышэй канкрэтных умоў дадаюць новыя характарыстыкі: фарміраванне памяці аб агульным гістарычным мінулым, актыўнасць лінгвістычных і культурных стасункаў, уяўленне аб укладзе ўсіх прадстаўнікоў супольнасці ў працэс гістарычнага развіцця. Па сцвярджэнні філосафа XIX ст. Э. Рэнана, нацыя – гэта душа, духоўны прынцып, які складаецца з багатай спадчыны ўспамінаў аб мінулым і «згоды, жадання жыць разам» [цыт. па: 6, с. 599; пераклад наш. – *М. Б.*].

У сувязі са сказаным адзначым, што менавіта нацыянальны музей прызваны раскрываць гістарычныя карані народа, адлюстроўваць і па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пулярызаваць яго поспехі ва ўсіх сферах эканамічнага, палітычнага, сацыякультурнага жыцця.

Відавочна, што вызначэнне нацыі ўвабрала ў сябе шматлікія аб'ектыўна неабходныя характарыстыкі, да якіх мы звернемся ў сувязі з разглядам развіцця нацыянальнага адраджэння ў XIX – пачатку XX ст. у беларускіх губернях.

Галоўнай задачай артыкула з'яўляецца адлюстраванне ўзаемаўплыву і ўзаемадзеяння такіх, здавалася б, далёкіх працэсаў, як, з аднаго боку, афармленне нацыянальнай ідэі і на яе падмурку зараджэнне нацыянальна-вызваленчага руху, з другога – заснаванне нацыянальнага музея. Яны разглядаюцца як своеасаблівае праяўленне гатоўнасці тытульнага этнасу да ўсведамлення агульнага гістарычнага мінулага і роўнасці ўсіх прадстаўнікоў супольнасці ў яго стварэнні, а таксама як адпаведнасць агульнаеўрапейскай тэндэнцыі. Аб'ектам аналізу з'яўляецца нацыянальна-вызваленчы рух і развіццё музейнай справы ў беларускіх губернях у пазначаны перыяд.

Падкрэслім, што ў такім ракурсе пытанне не разглядалася, хаця нацыянальна-вызваленчаму руху прысвечана шмат навуковай літаратуры, распрацавана праблема стварэння нацыянальнага музея. Найбольш цікавыя ў дадзеным кантэксце навуковыя і вучэбна-метадычныя работы А. Гужалоўскага – «Нараджэнне беларускага музея», «Гісторыя музейнай справы Беларусі», артыкулы І. Грабянчука і А. Сушы, апублікаваныя ў часопісе «Музейны веснік», Т. Дворкіна, П. Церашковіча, М. Мадэстава, А. Калякінай, В. Бяззубавай і інш. Надзвычай важнае значэнне для навукоўцаў у галіне гісторыі і тэорыі музейнай справы набыў зборнік дакументаў і матэрыялаў «Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков», падрыхтаваны калектывам расійскіх вучоных – музеязнаўцаў.

Адзначым, што распрацоўка нацыянальнай ідэі і праграмы нацыянальных рухаў – працэс складаны, шматгранны і храналагічна працяглы. Непасрэднае ўздзеянне на яго зараджэнне ў агульнаеўрапейскім маштабе аказалі вынікі барацьбы за незалежнасць Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў і Вялікай французскай рэвалюцыі. Асабліва актыўна ідэі нацыянальнага адраджэння пачалі распаўсюджвацца сярод народаў Цэнтральнай Еўропы – венграў, славакаў, чэхаў. Гэта праяўлялася ў фарміраванні нацыянальных літаратурных моў і развіцці літаратуры, зараджэнні лінгвістыкі. Вонкавым адлюстраваннем імкнення да нацыянальнага адраджэння і праяў нацыянальнай свядомасці стала стварэнне Венгерскага нацыянальнага музея ў Будапешце (1802; па ініцыятыве графа Ферэнца Сечэні), Нацыянальнага музея ў Празе (1818), у падмурак якога былі пакладзены калекцыі графа К. Штэрнберга, І. Шульца, арганізацыйная ініцыятыва і талент гісторыка Ф. Палацкага.

Можна пагадзіцца з заўвагай В. Калякінай, што ў дзеяннях чэшскай і венгерскай арыстакратыі галоўным стала імкненне замацаваць

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

(у свядомасці еўрапейскай супольнасці. – *М. Б.*) факт існавання свайго народа, і гэта з'яўлялася асабліва значным пры фарміраванні нацыянальнай ідэі ва ўмовах разгортвання нацыянальна-вызваленчага руху [7, с. 30].

Эвалюцыя нацыянальна-вызваленчых рухаў народаў Цэнтральнай Еўропы выразна адлюстроўвае неабходнасць для дасягнення пастаўленай мэты існавання наступных умоў: наяўнасць нацыянальнай інтэлігенцыі як вядучай арганізацыйнай сілы, моцнага эканамічнага падмурка і выразнай ідэалагічнай праграмы нацыянальнага самавызначэння. У сваім імкненні да стварэння нацыянальнай дзяржавы ні венгры, ні славянскія супольнасці, у тым ліку і беларусы, не маглі разлічваць на ўсебаковую падтрымку дзяржаў, у межах якіх яны знаходзіліся. Аднак у чэхаў, славакаў, венграў асобы, якія ўзначалілі нацыянальны рух, мелі дастаткова распрацаваную праграму і эканамічныя магчымасці для яе падтрымкі. Вышэй упаміналася аб стварэнні нацыянальных музеяў на базе прыватных калекцый. Можна дадаць і факт арганізацыі музеямі, напрыклад Пражскім, выданняў, у якіх папулярызавалася народная творчасць. Як немалаважны фактар паспяховага разгортвання нацыянальных рухаў можна разглядаць больш-менш талерантную пазіцыю ў нацыянальным пытанні правячых колаў Аўстрыйскай, а пазней Аўстра-Венгерскай імперыі.

У Расійскай імперыі ўздым патрыятычных пачуццяў быў выкліканы перамогай над напалеонаўскай Францыяй. Ён праявіўся ва ўсіх сферах мастацкага і культурнага жыцця. Назіраўся прыкметны ўздым нацыянальнага гонару. Ён ахапіў усе слаі грамадства і праяўляўся ў шматлікіх рэлігійных урачыстасцях і масавых святах, захапленні арыстакратыі стылізаваным народным касцюмам і рускай мовай. Грамадства было пранізана ідэямі самадзяржаўя, народнасці, праваслаўя, стварэння нацыянальных школ у галіне жывапісу, музыкі, архітэктуры, вывучэння ўзрастаючых інтарэсаў да народнай творчасці і гістарычнага шляху Расіі.

Па ініцыятыве прыватных асоб, навуковых таварыстваў, грамадскіх аб'яднанняў пачалі фарміравацца музейныя зборы. Для большасці з іх было характэрна разнастайнае, не сістэматызаванае, не профільнае збіральніцтва, што адпавядала працэсу накаплення музейнага матэрыялу і ў які дзяржава фактычна не ўмешвалася, аддаючы ініцыятыву прыватным асобам і мясцовым уладам. На хвалі захаплення археалагічнымі адкрыццямі створаны музеі ў Феадосіі (1811), Адэсе (1825), Керчы (1826).

У першай палавіне XIX ст. з'явіліся арыгінальныя праекты, накіраваныя на актывізацыю музейнай справы. Найбольш прыкметнымі былі ідэі, выказаныя сябрамі гуртка М. Румянцава, які існаваў у 1810–1820 гг., Ф. Адэлунгам і Б. Віхманам. Ф. Адэлунг апублікаваў «Прапанову аб стварэнні (учреждении) Рускага Нацыянальнага Музея» (1817),

Б. Віхман – праект пад назваю «Расійскі Айчынны музей» (1820). Канцэпцыі, выказаныя аўтарамі, дастаткова арыгінальныя і ў будучым некаторыя іх ідэі былі выкарыстаны [10, с. 87].

Ініцыятыва стварэння музеяў ваенна-гістарычнага профілю праявілася ў памежных рэгіёнах, у тым ліку ў Арэнбургскім краі па прапанове генерал-губернатара П. Сухтэлена. Непасрэднае дачыненне да стварэння арэнбургскага музея меў Тамаш Зан, сасланы ў гэтую мясцовасць (1824) за ўдзел у дзейнасці тайных таварыстваў філаматаў і філарэтаў. Ён праявіў сябе як даследчык прыроднага багацця і звычаяў Арэнбургскага краю і 25 студзеня 1831 г. быў прызначаны «устроителем музеума при Неплюевском кадетском корпусе» [9]. Аднак ён прыступіў да выканання сваіх абавязкаў толькі ў лістападзе 1831 г. пасля выканання даручэння па аглядзе мясцовага прыгранічнага казацкага войска. Мабыць, у гэтым прамежку часу Т. Зан распрацаваў праграму «Аб мэтах і спосабах утрымання прапанаванага Музэюма ў Арэнбургу». Аўтарская копія яе захоўваецца ў Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта, а ў 2010 г. апублікавана ў зборніку «Музееведческая мысль России» [10].

Падрабязна ахарактарызаваў змест дакумента Т. Зана А. Гужалоўскі. Ён звярнуў увагу на значэнне, якое надаваў Т. Зан дакументаванню акаляючай сацыякультурнай прасторы, сістэматызацыі і прадуманым камплектаванні калекцый, неабходнасці актуалізацыі музейных збораў праз пашырэнне магчымасці доступу да іх шырокіх колаў наведвальнікаў і актывізацыі асветніцкай дзейнасці [3, с. 63].

Самую важную частку запіскі Т. Зана пад назвай «Неабходнасць музея народнага» [9] можна разумець як задачу стварэння агульнацыянальнага музея (што азначала збіранне прадметаў, якія б дазвалялі падрабязна азнаёміцца з асаблівасцямі Расійскага краю і яго насельнікаў). Прадугледжваліся выданне часопісаў, арганізацыя спецыяльных курсаў, свабодны доступ наведвальнікаў і тлумачэнні спецыялістаў. Т. Зан распрацаваў праект музейнай структуры, на вяршыні якой знаходзіўся галоўны народны (нацыянальны музей), а асноўную частку складалі мясцовыя прыватныя музеі. На яго думку, не толькі «навучэнцы і адукаваныя, але і просты араты, заводчык і рамеснік, купец і работнік будуць мець магчымасць у абласным сваім горадзе ўбачыць сабраныя ў адным месцы прадметы свайго краю…» [10, с. 119]. Сапраўды, яго ідэі, на думку А. Гужалоўскага, апярэдзілі свой час, а іх рэалістычнасць была даказана далейшым развіццём музейнай справы. Безумоўна, Т. Зан не ставіў пытанне аб стварэнні нацыянальных музеяў на ўскраінах Расійскай імперыі, размова вялася толькі аб агульнарасійскім музеі. Наколькі дзейнасць Т. Зана паўплывала на актывізацыю ў 1840-х гг. працэсу музейнага збіральніцтва на радзіме, дакладна вызначыць немагчыма. Аднак, калі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўлічыць яго надзвычай высокі аўтарытэт сярод мясцовай шляхты, гэта можна дапусціць.

У пачатку XIX ст. толькі пачалі праяўляцца прыкметы беларускага нацыянальнага абуджэння, носьбітамі якіх сталі г. зв. «паповічы», выхадцы з сем'яў уніяцкага духавенства Супрасльскай епархіі Беластоцкай акругі. Вырашальным фактарам фарміравання пачуцця нацыянальнай свядомасці ў тутэйшага духавенства можна разглядаць перыяд 12-гадовага панавання ў гэтай мясцовасці пратэстанцкай Прусіі, дзе рэлігійная палітыка была больш талерантнай, чым у праваслаўнай Расіі [11, с. 32]. Вядомыя віленскія прафесары М. Баброўскі, І. Даніловіч, І. Анацэвіч, П. Сасноўскі, Я. Ярашэвіч, якія нарадзіліся ў сем'ях уніяцкіх святароў Супрасльскай епархіі, зрабілі першыя крокі на шляху адкрыцця, збірання і вывучэння важнейшых артэфактаў беларускага гістарычнага мінулага: ад тэксту Судзебніка Казіміра Ягелончыка да Супрасльскага кодэкса XI ст. – найстаражытнейшага помніка кірылічнага пісьменства (у 2007 г. быў уключаны ў рэестр Міжнароднага праекта ЮНЕСКА «Помнікі сусвету»). У цэлым было знойдзена 2383 гістарычныя дакументы [11, с. 2].

На агульнаеўрапейскай хвалі рамантычнага захаплення гістарычным мінулым сваіх народаў падобны рух узнік і ў Беларусі. Спачатку гэта былі спробы занатавання народных паданняў, казак, прымавак, песень і інш. Па меры назапашвання і асэнсавання матэрыялу многія з аматараў-даследчыкаў народнай культуры пераходзілі да выкарыстання сюжэтаў, асобных трапных выразаў і слоў беларускай мовы ў сваёй творчасці. Да іх можна аднесці Я. Баршчэўскага, Я. Чачота, А. Кіркора, В. Дуніна-Марцінкевіча і інш. Аднак, па-першае, большасць іх твораў была напісана па-польску, па-другое, іх тыражаванне і распаўсюджанне было мінімальным, таму творы аказаліся мала- ці зусім невядомымі мясцоваму насельніцтву.

Навуковыя адкрыцці павінны былі падхапіць і памножыць больш шырокія колы інтэлігенцыі беларускіх губерняў. Аднак па аб'ектыўных прычынах, якія дастаткова раскрыты даследчыкамі, гэты працэс расцягнуўся амаль на стагоддзе. Па трапнай выснове польскага навукоўцы Ю. Бардаха, большасць мясцовага дваранства ведала аб сваім літоўскім ці беларускім этнічным паходжанні, але ўспрымала моўную і культурную паланізацыю продкаў як іх палітычны і цывілізацыйны выбар [8]. На думку С. М. Токця, які асноўваўся на даных Міністэрства юстыцыі за 1858 г., у пяці беларуска-літоўскіх губернях на гэты час пражывала 220 573 асобы (мужчын і жанчын) шляхецкага паходжання. Толькі 14 % з іх валодалі маёнткамі і прыгоннымі сялянамі, астатнія прадстаўлялі засцянковую ці чыншавую шляхту [13, с. 315–316]. Менавіта яна вызначалася актыўным патрыятызмам, уяўляла масавую базу змагароў за незалежнасць былой радзімы ў трох шляхецкіх паўстаннях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадзянская пазіцыя прадстаўнікоў вышэйшага пануючага саслоўя заставалася кансерватыўнай. У той жа час, валодаючы значнымі фінансавымі магчымасцямі, найбольш прагрэсіўнае дваранства беларускіх губерняў прытрымлівалася агульнаеўрапейскай традыцыі і актыўна займалася пошукам і захаваннем артэфактаў гісторыі і культуры былой радзімы – Вялікага Княства Літоўскага, а таксама сусветнай мастацкай культуры. Шырока вядома аб багатых прыватных калекцыях нясвіжскіх Радзівілаў, магнацкага роду Сапег, І. Храптовіча, Г. Ябланоўскай, К. Тызенгаўза і інш. Відавочны інтарэс да пошуку артэфактаў гісторыі і культуры родных мясцін зараджаўся і сярод заможных колаў шляхты. Найбольш выразна праяўлялася дзейнасць графаў Канстанціна і Яўстафа Тышкевічаў у вывучэнні Лагойшчыны і Мінскай губерні ў цэлым. Распачатыя К. Тышкевічам археалагічныя раскопкі, збор этнаграфічных матэрыялаў склалі аснову дастаткова вядомага музейнага збору ў Лагойскім палацы. Вынікам пошукавай работы Яўстафа Тышкевіча стала даследаванне «Апісанне Барысаўскага павета», не так даўно перакладзенае з польскай мовы барысаўчанамі – патрыётамі сваёй малой радзімы. Гэта, на наш погляд, адзін з найлепшых твораў, прысвечаных эканамічнаму стану канкрэтнага рэгіёна і традыцыйнай культуры яго насельніцтва.

Значны ўнёсак у вывучэнне археаграфічных помнікаў даўніны як мецэнат і навукоўца ажыццявіў граф М. Румянцаў, які з 1813 г. па 1826 г. пераважна пражываў у Гомельскім палацы. На яго сродкі ажыццяўлялася пошукавая праца ў архівах старажытных беларускіх гарадоў, пры яго падтрымцы была выдадзена работа І. Грыгаровіча «Слоўнік карэнных беларускіх слоў». Асабіста сам граф Мікалай Пятровіч рабіў выпіскі, копіі арыгіналаў, яму пашчасціла адшукаць адзін з «барысавых камянёў». Яго калекцыі склалі падмурак музея, адкрытага ў Санкт-Пецярбургу ў 1831 г., пазней яны былі перавезены ў Маскву.

Прыватныя зборы розных кірункаў сфарміравалі ўласнікі іншых месцаў, напрыклад, уладальнік маёнтка Дабраўляны А. Гюнтэр валодаў ваенна-гістарычнай калекцыяй, уладальнік маёнтка Шаўры Т. Нарбут – зборам археалагічных артэфактаў, рэдкіх рукапісаў, а А. Плятэр у Краслава калекцыяніраваў прадметы і дакументы беларускай даўніны і інш. Акрамя прыватных збораў гістарычнага зместу, у многіх маёнтках заможнай шляхты, напрыклад Астрашыцкім Гарадку М. Тышкевіча, Косаўскім палацы В. Пуслоўскага і інш. знаходзіліся багатыя калекцыі мастацтва – жывапісныя работы знакамітых еўрапейскіх майстроў, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, старажытнай і антычнай культуры і інш.

Відавочна, што ў беларускіх губернях у першай палавіне XIX ст. актыўна адбываўся працэс стварэння самых разнастайных прыватных калекцый. Некаторыя з іх уладальнікаў, дзякуючы знаёмству

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з аналагічнымі працэсамі ў еўрапейскіх краінах, прыйшлі да высновы аб неабходнасці адкрываць дзверы сваіх сховішч перад тымі, хто імкнецца да ведаў. Найбольш выразна такую думку выказаў граф К. Тышкевіч у 1847 г. Аднак у яго выказванні не было слоў аб значэнні калекцый для распрацоўкі ідэі самавызначэння мясцовай супольнасці, увага надавалася навуковаму і адукацыйнаму аспектам. Разам з тым асэнсаваная неабходнасць публічнага прызнання прыватных калекцый актуалізавала імкненне да стварэння публічнага музея.

Такім чынам, першая палавіна XIX ст. вызначаецца, з аднаго боку, як перыяд зараджэння нацыянальных рухаў і распрацоўкі першых абрысаў нацыянальнай ідэі, з другога – аналагічнымі працэсамі ў музейнай справе: прыкметнай актывізацыяй прыватнай ініцыятывы па фарміраванні разнастайных калекцый і распрацоўкай канцэпцый развіцця музейнай сеткі.

Рэформы 1860–1870 гг., якія ахапілі фактычна ўсе сферы эканамічнага, палітычнага, сацыякультурнага жыцця Расійскай імперыі, актывізавалі працэс яе мадэрнізацыі, адначасова выклікалі ажыўленне інтарэсу да нацыянальнай спадчыны і імкненне да нацыянальнага самавызначэння. Для вярхоў тытульнай супольнасці імперыі стала характэрным ужыванне рускай мовы і зварот да рускай моды ў свецкім жыцці, што павінна было дэманстраваць адзінства ўсіх саслоўяў, вернасць традыцыям. Важнейшай прыкметай фарміравання нацыянальнай дзяржавы стала распрацоўка афіцыйнай ідэалогіі – знакамітай трыяды: самадзяржаўе, народнасць, праваслаўе. На працягу стагоддзя набірала моц нацыянальная плынь ва ўсіх відах мастацтва. Актыўна развівалася гістарычная навука, галоўнай задачай якой з'яўлялася адлюстраванне самабытнага шляху Расіі, вызначэнне яе месца ў еўрапейскай і сусветнай гісторыі. На наш погляд, сказанае вышэй выразна адлюстроўвае спалучэнне зацікаўленасці дзяржавы і ініцыятывы адукаваных колаў грамадства ў актуалізацыі ўяўленняў аб нацыянальнай самабытнасці і адзінстве рускага этнасу, пашырэнні яго самасвядомасці, распрацоўцы нацыянальнай ідэі і з'яўляецца выразным прыкладам да тэорыі М. Гроха, аб якой згадвалася вышэй.

Накапленне матэрыяльных артэфактаў, якое адбывалася падчас шматлікіх археалагічных, этнаграфічных экспедыцый, патрабавала іх сістэматызацыі, вывучэння, папулярызацыі і прэзентацыі. Ініцыятарамі гэтых працэсаў выступалі навуковыя таварыствы: Імператарскае таварыства гісторыі і старажытнасцей расійскіх пры Маскоўскім універсітэце, Археаграфічная камісія, Маскоўскае археалагічнае таварыства і інш. Іх задача, па трапным выразе І. Забеліна, заключалася ў справе «приведения в ясность Российской истории» [цыт. па: 7, с. 35].

Уздым навуковай і культурнай актыўнасці, які ўздзейнічаў не толькі на развіццё нацыянальнага самавызначэння, але і на ўсе бакі грамад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скага жыцця, заканамерна прывёў да неабоднасці паглыблення музейнай культуры, актуалізацыі музейнага руху. На пачатак 1870-х гг. у Расійскай імперыі існавала каля 80 музеяў, многія з іх у правінцыі, але ў наступныя дзесяцігоддзі пачаўся сапраўдны «музейны век». Ён характарызаваўся шматлікімі публічнымі дыскусіямі па праблеме нацыянальнай ідэнтычнасці, шматлікімі мастацкімі выставамі, Усерасійскай этнаграфічнай (1867), Політэхнічнай (1872) і інш., стварэннем Гістарычнага музея ў Маскве (заснаваны ў 1872 г. як «Музей им. Его Императорского Высочества Государя Наследника Цесаревича»), Траццякоўскай галерэі, Рускага музея і інш. Новастворанья музеі выступалі як своеасаблівыя маркеры нацыянальнай ідэнтычнасці, дзякуючы прэзентацыі мастацкіх, гістарычных, духоўных каштоўнасцей, якія былі створаны рускім народам на доўгім шляху эвалюцыі і з'яўляліся самабытнымі, характэрнымі для рускай нацыі.

«Музейны век» у Расійскай імперыі арганізацыйна завяршыўся папярэднім з'ездам (Першы з'езд планавалася склікаць у 1915 г.) музейных работнікаў, які адбыўся 27–30 верасня 1912 г. На ім прысутнічалі 90 чалавек, прадстаўнікі большасці мясцовых музеяў не былі запрошаны [5]. Тым не менш гэты з'езд музейшчыкаў прадэманстраваў уяўленне аб музеях як абавязковай частцы (своеасаблівай норме) культурнага жыцця.

Як адбывалася развіццё музейнай справы ў беларускіх губернях у другой палавіне XIX ст.? Сярод разнастайных ацэнак даследчыкаў звяртаюць на сябе ўвагу наступныя: адмаўленне прыкмет музейнага руху, адсутнасць мэтанакіраванага ўздзеяння дзяржавы на музейную справу [4, с. 33; 5, с. 20]. На наш погляд, адказ на гэта пытанне дастаткова складаны і неадназначны. Ён цесна ўвязаны з пашырэннем нацыянальна-вызваленчага руху і тым месцам, якое ў ім занялі розныя пласты насельніцтва.

Найбольш актыўнай сілай беларускага нацыянальнага адраджэння выступалі прадстаўнікі дробнай шляхты. Падаецца, што першасным штуршком да ўсведамлення ёю сваёй аўтэнтычнасці з навакольным атачэннем – беларускамоўным сялянствам, паслужыў так званы разбор шляхты. Перавод значнай колькасці шляхецкіх сем'яў у разрад сялян-аднадворцаў у пэўнай ступені прымусіў іх збліжацца з суседзямі. Пасля падзей 1863–1864 гг. дробная шляхта аказалася поўнасцю адхіленай ад удзелу ў грамадскім жыцці і змушана была вярнуцца да зямлі або шукаць сябе ў незалежных прафесіях і тым самым уключыцца ў працэс сацыяльнай трансфармацыі. Пад націскам расійскага эканамічнага, палітычнага і культурнага ўплыву, які ў Паўночна-Заходнім краі выразна праявіўся ў 70–90-я гг. XIX ст., польскі ўплыў быў вымушаны адступіць. І ў гэты час, як трапна пісаў А. Цвікевіч, пад вясковай страхой, у шляхецкім засценку ды ў старасвецкім панскім двары ў Беларусі абвастрыліся спрад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вечныя пытанні аб тым, што значаць «тутэйшы край» і «тутэйшы народ» [14, с. 187]. Адказ на іх пачалі даваць прадстаўнікі дробнай шляхты: Ф. Багушэвіч, Я. Неслухоўскі (Янка Лучына), І. Луцэвіч (Янка Купала) і інш.

У другой палавіне XIX ст. у асяроддзі збяднелай шляхты зараджалася ўяўленне аб сваім беларускім паходжанні, аб мясцовым насельніцтве, сярод якога яны выраслі, як аб этнічнай супольнасці з багатай гісторыяй і культурнай спадчынай. З яе радоў выйшлі не толькі даследчыкі беларускага фальклору і этнаграфіі, але зачынальнікі і актыўныя дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху, ініцыятары стварэння этнаграфічных аддзелаў у існуючых у той час музеях пры статыстычных камітэтах і пры духоўным ведамстве. Беларускаму этнасу, пераважна сялянскаму, патрэбен быў час, каб прадстаўнікі з іншага (шляхецкага) сацыяльнага асяроддзя змаглі сфарміраваць мясцовую інтэлігенцыю, выпрацаваць літаратурную мову на базе народнай, стварыць розныя жанры літаратуры, вывучаць гісторыю, этнаграфію і фальклор і, самае галоўнае, несці свае дасягненні ў народ.

Сацыяльны і этнічны склад інтэлігенцыі беларуска-літоўскіх губерняў быў стракатым, што прадвызначала яе грамадзянскую пазіцыю. Дэмакратычныя погляды, упэўненасць у самабытнасці беларускага этнасу не перашкодзілі прадстаўнікам творчай інтэлігенцыі В. Дуніну-Марцінкевічу, Ф. Багушэвічу, сям'і Нарбутаў і інш. прыняць удзел у паўстанні 1863–1864 гг. пад заклікам аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

Пасля падаўлення паўстання фарміраванне інтэлігенцыі Беларусі прыпынілася і актывізавалася толькі з канца 1870-х гг. Гэты працэс звязаны з пашырэннем адукацыі на ўсе сацыяльныя групы насельніцтва. Далучэнне малазаможнай шляхты, сялянства, мяшчан да адукацыі садзейнічала з'яўленню разначыннай інтэлігенцыі, выхадцаў з розных слаёў насельніцтва, якія працавалі пасля атрымання адукацыі чыноўнікамі, настаўнікамі, фельчарамі і інш. Некаторыя прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі пачалі ўключацца ў культурна-асветную дзейнасць, распрацоўваць і пашыраць сферу ўжывання беларускай мовы. Згодна з перапісам 1897 г., беларусам (па мове) лічыў сябе кожны пяты настаўнік, кожны чацвёрты медыцынскі работнік, 61 адвакат з 627 дзеючых адвакатаў і, звернем увагу, 96 з 987 дзеячаў літаратуры, мастацтва, навукі. Гэтыя лічбы з'яўляюцца паказчыкам узроўню нацыянальнай свядомасці мясцовай творчай інтэлігенцыі.

Пачатак фарміравання нацыянальна арыентаванай плыні ў асяроддзі нешматлікай інтэлігенцыі беларускіх губерняў звязаны з дзейнасцю студэнцкай моладзі ў Санкт-Пецярбургу і іншых універсітэцкіх гарадах Расіі. Тайныя студэнцкія гурткі выдавалі адозвы, брашуры, газеты, у якіх раскрывалі самабытнасць беларускага народа.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Разнастайныя думкі аб шляхах нацыянальнага абуджэння знайшлі адлюстраванне ў 1884 г. на старонках двух нумароў часопіса «Гомон», які выйшаў на рускай мове, а таксама ў адозвах і брашурах – «Да беларускай моладзі», «Пісьмы пра Беларусь. Пісьмо першае», «Пасланне да землякоў-беларусаў ад імя “Шчырага беларуса”» і інш. У матэрыялах выразна праглядаецца пазіцыя «сацыяльна-рэвалюцыйнай групы беларусаў» – так ахарактарызавалі сваё аб’яднанне гоманаўцы. Яны разглядалі сябе як прадстаўнікоў беларускага этнасу.

Гоманаўцы лічылі, што Беларусь павінна быць для беларусаў, палемізавалі з расійскімі народнікамі, якія разглядалі ідэю стварэння новых нацыянальнасцей «недарэчнай», падкрэслівалі своеасаблівасць культуры, мовы, характару беларусаў, адрозненне эканамічных і культурных умоў ад суседзяў, прызнавалі найбольш эфектыўнай дзейнасць сярод свайго народа з апорай на яго мову, традыцыі, інтарэсы і г. д. У першым нумары часопіса «Гомон», выдадзеным у пачатку 1884 г., была размешчана інфармацыя аб распаўсюджванні адозвы «Да беларускай інтэлігенцыі». Гоманаўцы разглядалі адозву як выразную прыкмету абуджэння нацыянальнага руху, не толькі зыходзячы са зместу, але і з таго, што адозва распаўсюджвалася ў многіх гарадах Беларусі. Аўтары адозвы звярталіся да беларускай інтэлігенцыі з заклікам разварушыць магутныя сілы народа, даць яму магчымасць праявіць свой нацыянальны геній. Усё вышэйсказанае з’яўляецца сведчаннем працэсу афармлення беларускай нацыянальнай ідэі.

Кожны з удзельнікаў беларускага адраджэння сваім шляхам далучаўся да яго. Згадаем яскравы прыклад з біяграфіі вядомага пісьменніка Ядвігіна Ш. (Лявіцкага). У 1890 г. яго, студэнта медыцынскага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта, арыштавалі за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. Студэнты-вязні выпускалі рукапісную газету, аднойчы наладзілі канцэрт, на якім выступалі рускія, украінцы, літоўцы, латышы, палякі і інш. Пасля канцэрта сябры мінскага зямляцтва доўга не спалі. Размова ў іх ішла пра Беларусь, пра яе долю, яе цудоўныя песні, якіх не пачулі на канцэрце. Тут жа ў Бутырцы было вырашана заснаваць беларускі гурток у Маскве і любымі сродкамі, легальнымі ці нелегальнымі, адраджаць беларускую культуру, узнімаць нацыянальную самасвядомасць народа.

Што датычыцца заможных колаў нашай шляхты, то яны не толькі не ўзначалілі нацыянальны рух, а можна сказаць за рэдкім выключэннем занялі негатыўную пазіцыю. Ідэя краёвасці, якую распрацавала частка ўплывовых землеўласнікаў і прадпрымальнікаў беларускага краю, прадугледжвала перш за ўсё палітычны варыянт самавызначэння тутэйшай супольнасці ў форме Вялікага Княства Літоўскага як аўтаноміі, у складзе Расійскай дзяржавы.

Знакавай вяхой на шляху афармлення нацыянальнай ідэі стала стварэнне першай беларускай нацыянальнай партыі – Беларускай рэвалю-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнай (сацыялістычнай) грамады – і распрацоўка яе праграмы, якая адпавядала інтарэсам не толькі тытульнага этнасу, але і іншых этнічных груп, якія пражывалі ў беларускіх губернях.

Такім чынам, перад Першай сусветнай вайной беларускі нацыянальны рух выглядаў акрэсленым, аб гэтым сведчыла наяўнасць партыі і праграмы, нацыянальнай інтэлігенцыі, твораў на літаратурнай мове, першых выданняў па гісторыі Беларусі. Але пытанне аб дзяржаўнай форме нацыянальнага самавызначэння беларусаў становіцца цэнтральнай праблемай грамадска-палітычнага жыцця пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г.

У сувязі з тым, што імперская ўлада не была зацікаўлена ў садзейнічанні нацыянальным рухам на ўскрайках імперыі, не падтрымлівалася імкненне мясцовай інтэлігенцыі да стварэння публічных музеяў, якія б праз музейныя прадметы маглі выразна дэманстраваць самабытнасць культуры і гісторыі мясцовай супольнасці, фарміраваць яе ідэялізаваны вобраз, паказваць яе адрозненне ад суседзяў. Тым не менш, дзякуючы рэлігійнаму, этнічнаму, моўнаму адзінству некаторыя супольнасці змаглі прыступіць да стварэння нацыянальных музеяў. Напрыклад, у 1896 г. адбылася Латышская этнаграфічная выстава ў г. Рыга, якая разглядалася як аснова будучага Нацыянальнага музея, у 1906 г. быў створаны Эстонскі нацыянальны музей.

У 1848 г. граф Я. Тышкевіч звярнуўся да віленскага генерал-губернатара І. Г. Бібікава з просьбай аб дазволе на стварэнне музея ў Вільні на аснове прыватнай калекцыі. Дазвол на адкрыццё «музеума древностей» быў атрыманы ў 1851 г., палажэнне «О Музеуме Древностей и Временной Археологической комиссии в Вильне» было зацверджана ў красавіку 1855 г., а 17 красавіка 1856 г. музей пачаў дзейнасць. Яго стваральнікі галоўнай задачай ставілі вывучэнне краю ў розных ракурсах, перш за ўсё ў гісторыка-краязнаўчым. Ініцыятары не падымалі пытання аб нацыянальным музеі, хаця многія з іх мелі цесныя навуковыя кантакты з калегамі з музеяў і грамадскіх навуковых аб’яднанняў Даніі, Расіі, Францыі і, безумоўна, ведалі аб гэтых тэндэнцыях у музейнай справе.

Аб калекцыі Віленскага музея, кірунках яго дзейнасці падрабязна раскрываецца ў работах А. Гужалоўскага, І. Грабянчука і інш. Звернем увагу на той факт, што ў музеі не прадугледжвалася стварэнне этнаграфічнага аддзела, які б выразна дэманстраваў розніцу паміж «свой» і «чужы». Я. Тышкевіч падкрэсліваў, што ён са сваімі паплечнікамі ствараў збор прадметаў, якія, нібы ў люстэрку, праўдзіва паказвалі б жыццё і справы літоўска-рускага народа ва ўсіх эпохах яго гістарычнага існавання [2, с. 36]. Гэтыя словы даказваюць, што музейныя калекцыі і дзейнасць Віленскага музея старажытнасцей аб’ектыўна былі накіраваны на фарміраванне памяці аб гістарычным мінулым былой радзімы –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікага Княства Літоўскага, і на гэтай падставе – мясцовага патрыятызму, які часта называюць «літоўскім сепаратызмам».

Далейшае развіццё Віленскага музея старажытнасцей было спынена спецыяльнай камісіяй, створанай пасля падаўлення шляхецкага паўстання 1863–1864 гг. па загадзе генерал-губернатара М. М. Мураўёва. Музей быў абвешчаны ідэялагічна шкоднай установай, цэнтрам польскага сепаратызму. А. Гужалоўскі паведамляе, што гісторыка-мастацкія прадметы (256 адзінак), якія, на думку камісіі, нагадвалі польскі ўплыў у краі і падтрымлівалі ў насельніцтва нядобрыя памкненні, былі перададзены ў Румянцаўскі музей у Маскве. Да такіх прадметаў аднеслі, напрыклад, партрэты Барбары Радзівіл, Антонія Тызенгаўза, Тэадора Нарбута, уніяцкія царкоўныя старажытнасці і інш. [3, с. 71]. Такім чынам, можна канстатаваць, што прамым умяшальніцтвам дзяржавы эвалюцыя музейнай справы ў нацыянальным кірунку ў беларускіх губернях была спынена.

У далейшым калекцыі Музея старажытнасцей (арніталагічная, мінералагічная, нумізматычная), якія не былі вывезены, утварылі музей пры Віленскай публічнай бібліятэцы. Дзейнасць музея ажывілася ў канцы XIX – пачатку XX ст. пасля прыходу ў яго штат вядомых даследчыкаў Ф. А. Бяльковіча, Д. І. Даўгялы, Ф. В. Пакроўскага, Е. Р. Раманава і інш. Дзякуючы ініцыятыве Е. Р. Раманава ў музеі планавалася стварэнне этнаграфічнага аддзела. Аднак даследчыкі адзначаюць адсутнасць дакументальных доказаў існавання такога аддзела ў пачатку XX ст., хаця ў 1880-я гг. ён існаваў, але быў прысвечаны этнаграфіі народаў Егіпта, Кітая, Японіі [2, с. 38].

Яшчэ адным кірункам усебаковага вывучэння і прэзентацыі беларускага краю стала дзейнасць статыстычных камітэтаў і музеяў пры іх, таму што спроба атрымаць ад улад дазвол на адкрыццё мясцовых навуковых аб'яднанняў закончылася нічым. Статыстычныя камітэты і музеі пры іх былі створаны ў цэнтрах беларускіх губерняў – Магілёве, Віцебску, Мінску, Гродне. Актыўнасцю і зацікаўленасцю вызначалася дзейнасць сакратароў статыстычных камітэтаў. Напрыклад, сакратар Магілёўскага камітэта А. А. Сіманоўскі пры дзейснай падтрымцы мясцовага губернатара А. С. Дамбавецкага стварыў музей, у адным з аддзелаў якога, дзякуючы супрацоўніцтву з П. В. Шэйнам, захоўваліся матэрыялы па этнаграфіі. У 1879 г. на Усерасійскай антрапалагічнай выставе яны былі адзначаны вышэйшымі ўзнагародамі. Вырашальная роля ў стварэнні музея пры Віцебскім статыстычным камітэце належала яго сакратару, вядомаму гісторыку-краязнаўцу А. М. Семянтоўскаму. Разам з археолагам-аматарам М. Ф. Кусцінскім ён прысутнічаў на Усерасійскай этнаграфічнай выставе (1867), тут жа былі і прадстаўнікі Гродзенскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

статыстычнага камітэта. Прадстаўленая на Політэхнічнай выставе ў Маскве (1872) музейная калекцыя з Віцебска, як і папярэднія, стала стымулам для далейшага развіцця музеяў пры статыстычных камітэтах.

Аднак заўважым, што дадзеныя музеі, як і царкоўна-археалагічныя, што былі створаны ў губернскіх цэнтрах, былі далёкія ад нацыянальнай ідэі і нацыянальнага руху, не ператварыліся яны і ў агульнадаступныя (публічныя). Галоўная іх заслуга ў збіранні, класіфікацыі, сістэматызацыі артэфактаў культуры. Нават актыўныя і вядомыя носьбіты палітычных, культурна-асветніцкіх, прагрэсіўных эканамічных і гаспадарчых ідэй, напрыклад Р. А. Скірмут, Э. А. Вайніловіч і інш., не падымалі пытанне аб стварэнні мясцовага публічнага музея, хаця, для прыкладу, уласнік маёнтка «Завоссе» А. Ельскі сабраў багатую калекцыю з 20 тыс. аўтографаў, 7 тыс. кніг, гравюр, манет і інш.

Па ініцыятыве Мінскага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі з кастрычніка 1912 г. разгарнулася праца па стварэнні гарадскога музея. Прадугледжваліся аддзелы гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, прыродазнаўства, мастацкіх промыслаў і інш. Аднак Першая сусветная вайна перакрэсліла планы арганізатараў, музей так і не здолеў разгарнуць дзейнасць.

Якую ж пазіцыю адносна стварэння публічнага беларускага музея заняла патрыятычна настроеная інтэлігенцыя? Такое пытанне не распрацоўвалася, хаця ініцыятар стварэння Беларускай сацыялістычнай грамады І. Луцкевіч актыўна займаўся археалагічнымі раскопкамі, пошукам і зборам артэфактаў гістарычнай і культурнай спадчыны беларусаў падчас этнаграфічных экспедыцый. Шляхі папулярызацыі свайго збору І. Луцкевіч шукаў розныя. Адзін з іх – перадача яго часткі Украінскаму царкоўнаму музею, які быў заснаваны ў 1905 г. у сталіцы Усходняй Галічыны г. Львове (з 1907 г. Нацыянальны музей), дзякуючы чаму ў ім з’явілася вялікая «беларуская калекцыя» [12, с. 7]. Другі – размяшчэнне часткі збору непасрэдна ў памяшканні рэдакцыі газеты «Наша ніва». Змітрок Бядуля яскрава апісаў выстаўленую калекцыю: «На сьценах вісяць абразы даўнейшых беларускіх князёў, старасьвецкія беларускія вопраткі, шаблі, шаломы і панцыры ваякаў XVI стагоддзя. Розныя тканіны народнай беларускай творчасьці, паясы слуцкія, дываны, разьба розная. Музыкальныя інструменты – дуда, цымбалы, труба пастырская, жалейка. У шафах ляжаць скарбы мінуўшых гадоў: манеты, медалі, пячаткі, кнігі беларускае пісьменнасьці. Жывая паэма старыны!..» [1].

Нарэшце можам канстатаваць, што восенню 1912 г. на старонках «Нашай нівы» прагучаў заклік да стварэння Беларускага музея: «…Клічэм усіх, хто спагадае адраджэнню 10-мільённага беларускага народа, памагчы нам у збіранні музэя…» [3, с. 88].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак Першая сусветная вайна перашкодзіла развіццю шырокай ініцыятывы ў гэтым кірунку, хаця важныя крокі па ініцыятыве І. Луцкевіча былі зроблены па-за межамі Беларусі. У Вільні дзейнічала Беларускае навуковае таварыства (1914–1918), якому І. Луцкевіч перадаў свой збор. На яго аснове быў створаны Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І. І. Луцкевіча (існаваў у Вільні ў 1921–1945).

Сказанае вышэй у пэўнай ступені адлюстроўвае складанасць працэсаў нацыянальнага адраджэння і ўзнікнення яго візуальнага маркера – нацыянальнага музея, які так і не быў створаны. Да Першай сусветнай вайны большасць зацікаўленых асоб разглядала музей галоўным чынам як установу, якая з'яўляецца часткаю навуковых таварыстваў – археалагічных, этнаграфічных, прыродазнаўчых і інш., і займаецца ў асноўным дакументаваннем (зборам) і вывучэннем прадметаў гісторыка-культурнай спадчыны. Раскол нацыянальнага руху прывёў да аналагічнага працэсу ў музейнай справе: у Вільні дзейнічаў Беларускі музей, у Савецкай Беларусі – Абласны, а з 1923 г. – Беларускі дзяржаўны музей.

1. *Арлоў, Уладзімір.* Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862–1918) / Уладзімір Арлоў, Генадзь Сагановіч. – Мінск, 2002. – С. 47.

2. *Грабянчук, І.* Віленскі музей старажытнасцей: заснавальнікі і наступнікі / І. Грабянчук // Музейны весн. / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 3. – С. 33–42.

3. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

4. *Дворкин, И. В.* Музей в украинском национальном движении второй половины XIX – начала XX в. / И. В. Дворкин // VI Луньовські читання. Сучасна музейна експозиція: вимоги часу та нові можливості : (до 60-річчя заснування Пархомівського художнього музею імені А. Ф. Луньова) : матеріали наук.-прак. семінару, 27 березня 2015 р. / Харківський нац. ун-т ім. В. Н. Каразіна ; Центр краєзнавства ім. акад. П. Т. Тронька [та ін.]; відп. ред. та упоряд. О. Г. Павлова; редкол.: Н. С. Вербук, О. Й. Денисенко. – Харків, 2016. – С. 29–35.

5. *Дианина, Е.* Музейный век в России / Е. Дианина // Музеология – музееведение в XXI веке. Проблемы изучения и преподавания : материалы Междунар. науч. конф. – СПб., 2009. – С. 20–31.

6. *Дэвис, Норман.* История Европы / Норман Дэвис. – М. : АСТ, 2004. – 943 с.

7. *Калякина, А. В.* Национальный музей как явление культурной жизни русского общества XIX в. и причины его возникновения / А. В. Калякина // Вопросы музеологии. – СПб., 2015. – № 2. – С. 29–37.

8. *Кравцевич А.* Белорусы: нация Пограничья / А. Кравцевич, А. Смоленчук, С. Токть. – Вильнюс, 2011. – С. 116.

9. *Модестов, Н.* Магистр философии Фома Карлович Зан в Оренбурге / Н. Модестов // Труды Оренбургской ученой архивной комиссии. – Вып. 35. – Оренбург, 2017. – С. 32.

10. Музееведческая мысль в России XVIII–XX вв. : сб. документов и материалов / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Этерна, 2010. – 960 с.

11. *Пустоход, Т. С.* Навукова-педагагічная і асветніцкая дзейнасць М. К. Баброўскага (1784–1848 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Т. С. Пустоход. – Мінск, 2017. – 152 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Суша, А. А.* Першыя спробы стварэння беларускага музея: Іван Луцкевіч і Львоў / А. А. Суша // Музейны весн. : зб. / Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь. – 2011. – Вып. 5. – С. 6–16.

*13. Токть, С. М.* Минская шляхта в Беларуси и Сибири [Электронный ресурс] / С. М. Токть. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/minskaya-shlyahta-v-belarusi-i-sibiri. – Дата доступа: 24.07.2018.

*14. Цьвікевіч, А.* «Западно-русизм» : нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цьвікевіч. – 2-е выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

*M. Byaspalaya*

**Museum as a visual symbol of national revival**

*On the basis of a comprehensive approach in combination with chronological and evolutionary principles the author of the article analyzes factors that influenced the process of national revival, the development of museum work in the Belarusian provinces of the XIXth – early XXth centuries. Political, social and cultural conditions that contributed to the emergence of private Belarusian museums and those created in libraries and statistical committees (their importance and disadvantages) are considered. The reasons that restrained the birth of the national museum as a marker of national identity in this period of time are revealed.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 03.01.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ